ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
19
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 10(1531)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### Плённай формай

працы універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» стала творчае супрацоўніцтва з шэрагам прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў г. Мінска. Праўленне таварыства «Веды» БДУ ці пярвічная факультэцкая арганізацыя заключаюць дагаворы аб узаемным творчым супрацоўніцтве з прадпрыемствам, установай. Такія дагаворы заключаны з арганізацыямі таварыства «Веды» Мінскага аўтазавода, НВА «Дормаш», ВА «Інтэграл».

Пярвічная арганізацыя геаграфічнага факультэта заключыла дагавор з ВІЗРВ. Лектарамі факультэта распрацаваны цыкл лекцый па краязнаўчай тэматыцы, які будзе прачытаны для прафесарска-выкладчыцкага саставу вучылішча. З боку ВІЗРВ прапаноўваецца цыкл лекцый для прафесарска-выкладчыцкага саставу нашага факультэта.

В. ШАБАНАВА,
старшыня таварыства «Веды» геаграфічнага факультэта.

### Студэнты

факультэта журналістыкі па ініцыятыве і з дапамогай выкладчыка гісторыі КПСС А. Сямёнавай даслалі дзве тэлеграмы праз пасольства ЗША ў Маскве. Адна з тэлеграм адрасавана доктару Хайдэру, у якой амерыканскага астрафізіка заклікаюць спыніць галадоўку пратэсту і працягваць змагацца за мір актыўна. У другой тэлеграме выказана рашучае патрабаванне да адміністрацыі ЗША закончыць выпрабаванні ядзернай зброі.

А. ПУЦІЛА.

### На канферэнцыі

працоўнага калектыву Бедзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва за 1986 год і прыняты сацыялістычныя абавязацельствы універсітэта на 1987 год.

Пераможцамі ў сацспаборніцтве мінулага года прызнаны калектывы: фізічнага факультэта, факультэта радыёфізікі і электронікі, ФПМ, кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, лабараторыі высокатэмпературных рэакцый, лабараторыі люмінесцэнцыі, сектара матэматычнага забеспячэння ЭВМ, участка радыёэлектронікі і пячатных плат, аддзелаў №№ 25, 5, кафедры педагогікі, кафедры марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, лабараторыі экстракцыйных і сарбцыйных працэсаў, лабараторыі радыяцыйнай хіміі, лабараторыі хіміі фатаграфічных працэсаў, лабараторыі спектраскапіі, лабараторыі радыёгалаграфіі, сектара дыягностыкі вылічальных сістэм, сектара прыкладной статыстыкі.

Ж. КРУГЛІКАВА.

*прафорг*



*ДЛЯ ВОЛЬГІ СЕГАЛОВІЧ прафсаюзная работа даўно стала справай прывычнай і добра знаёмай. Яна — член прафкома універсітэта, прафорг курса. Але гэта зусім не значыць, што дзейнасць яе абмяжоўваецца толькі набыццём для студэнтаў ільготных білетаў на гарадскі транспарт.*

*— Прафорг павінен вельмі добра ведаць сваіх аднакурснікаў. Ніколі не трэба чакаць, калі чалавек падыдзе і папросіць, напрыклад, матэрыяльную дапамогу. Наадварот, трэба самому прапаноўваць, калі бачыш, што некаму цяжка. Бо многія саромеюцца, самі ні за што не паскардзяцца на сваё складанае матэрыяльнае становішча,— лічыць прафорг Вольга Сегаловіч.*

*А яшчэ яна цікавіцца музыкай, вельмі любіць гуляць у валейбол і вучыцца амаль на адны пяцеркі.*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

*свет тваіх захапленняў*

## Мова эсперанта

Ведаеш, сябра, хачу прапанаваць табе адну рэч. Ты ж, мусіць, яшчэ не здарожыўся. Табе хочацца сустракацца з цікавымі людзьмі, паслухаць, выказаць сваю думку, паспрачацца. А калі гэты чалавек — замежнік? Аб чым ён думае, як жыве, што яго хвалюе: гісторыя Беларусі, старажытны Рым, альбо тэорыя верагоднасці? І для гэтага не трэба, не абавязкова ведаць французскую, англійскую, нямецкую ці іншую мовы. Тваім памочнікам стане эсперанта.

У ПАЛАЦЫ Белсаўпрофа кожны чацвер а сёмай гадзіне вечара збіраюцца людзі. Сівыя скроні схіляюцца над падручнікам, бадзёрыя дзіцячыя вочы чытаюць па складах.

Эсперанта — штучная дапаможная мова. Нарадзілася яна ў 1887 годзе ў Польшчы, калі ўрач Заменгоф выдаў кнігу-праект дапаможнай мовы. Аўтар падкрэсліваў, што размова ідзе не аб замене існуючых моў, а аб мове, якая будзе садзейнічаць аблягчэнню зносін паміж людзьмі, сяброўству, супрацоўніцтву, узаемаразуменню.

Да эсперанта ў свой час прыхільна ставіліся Л. Талстой і А. Барбюс, М. Горкі і К. Цыялкоўскі. На эсперанта пішуцца вершы і апавяданні, гучаць беларускія песні, перакладзены п'есы В. Шэкспіра, у розных кутках свету выходзяць часопісы і газеты.

Дык вось, шаноўны студэнт, калі ты не такі заняты, можаш збірацца з думкамі і прыняць рашэнні, то наведай клуб мінскіх эсперантыстаў, які за 20 гадоў свайго існавання знайшоў шмат сяброў у розных кутках краіны і за яе межамі, які набірае сваю сілу ў барацьбе за мір шляхам устанаўлення кантакту паміж людзьмі.

С. РАМАНАВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

*на шляху да прафесіі*

## «Выбіраю адказнасць»

Шлях да перамогі ніколі не бывае роўным, простым. Ён заўсёды супярэчліва цяжкі, круты. Пра гэта скажа кожны спартсмен. Гэта пацвердзіць вучоны. Сёння і Ігар Семеракоў, студэнт-чацвёртакурснік юрфака, скажа тое ж самае. Яго шлях да перамогі... Толькі разбудзі памяць і яна нагадае.

Перамога не адбылася ў адзін момант. Яна не прыйшла сама па сабе. Ён да яе ішоў. Як па лесвіцы ці крутой гары. Толькі наперад, толькі да канца. Другое месца на курсе, чацвёртае — на факультэце, трэцяе — у рэспубліцы. Вельмі нялёгка было рабіць гэтыя крокі. І чым вышэйшы быў узровень конкурсу, тым больш адказнасці прыходзілася браць на сябе.

Юнак не баяўся адказнасці. Ігар быў выхаваны на ёй. Ён валодае гэтым вялікім пачуццём —адказнасцю за сябе, за іншых, перад іншымі і перад сабой. Гэта, пэўна, яшчэ з Суворaўскага. Мара дзяцінства! Вучоба ў вучылішчы, форма суворaўца — гэта не проста радок біяграфіі і не толькі кавалачак жыцця. Гэта яшчэ частка выхавання, гэта яго рост, сталенне і мужанне. Для Ігара Семеракова гэта яшчэ, калі хочаце, крыніца энергіі на ўсё жыццё.

Усесаюзны конкурс студэнтаў юрыдычных факультэтаў праходзіў у Рызе, цудоўным прыбалтыйскім горадзе. Горад падарыў Ігару шмат сяброў з Украіны, Таджыкістана. А конкурс прынёс тое самае разуменне шляху да перамогі.

Даклад Ігара па крымінальнаму праву горача абмяркоўваўся. Шмат пытанняў задалі юнаку. На ўсе Ігар даў вычарпальныя адказы. Яго даклад заняў II месца. Наперадзе была яшчэ віктарына.

Так склаліся абставіны, што афіцэрам Ігар не стаў. Падаў дакументы на юрыдычны. Тады падвяла яго чацвёрка па сачыненню. Трохі здзівіла прапанова пайсці на завочнае аддзяленне. Здзівіла, і тым не менш ён яе прыняў. Вучыўся, працаваў у родным Наваполацку токарам на заводзе. Стараўся. Пасля першага курса перавёўся на дзённае аддзяленне.

Я не магу гаварыць аб тым, што перажываў Ігар у апошнія мінуты перад віктарынай. Узровень конкурсу — Усесаюзны. Думкі сканцэнтраваны. Што ён, будучы юрыст, ведае? На гэта пытанне адказ дасць віктарына.

«Ігарам Барысавічам» клічуць сябры. І жартуючы, і сур'ёзна. Як тлумачыцца гэта?

— Паважаем Ігара за яго сумленныя адносіны да таварышаў, да вучобы. У яго залікоўцы — ніводнай чацвёркі! Ён ведае больш за многіх з нас, прыйшоўшых на факультэт адразу пасля школы ці арміі.

38 балаў! Гэта максімум віктарыны. Гэтага максімуму дасягнуў Ігар. Пераможцам Усесаюзнага конкурсу студэнтаў юрыдычных факультэтаў краіны стаў наш зямляк, наш універсітэцкі таварыш — студэнт IV курса юрфака Ігар Семеракоў.

Перад Новым годам Ігару прыйшла пасылка з Таджыкістана — гасцінцы ад былых супернікаў па конкурсу, а цяпер добрых сяброў, таксама юрыстаў, і нічога, што пакуль толькі будучых.

Ж. МІРОНАВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

спадчына: памятаць і зберагчы







# ПАДАРОЖЖА Ў МІНУЛАЕ



СЕННЯ тэзіс аб неабходнасці ўважлівых адносін да архітэктурнай спадчыны ўжо не абавязкова падмацоўваць спасылкамі на аўтарытэты. Гэта патрабаванне часу, і яно разумеецца большасцю, хаця кансерватары-прагматыкі ёсць і тут.

У мінулым годзе ў краіне створаны фонд культуры, які заклікаюы матэрыялізаваць і надаць больш маштабны і арганізаваны характар працэсу ўзрастання цікавасці да роднай гісторыі, народных звычаяў, мовы. Культура існуе ў дыялектычнай узаемасувязі ўсіх сваіх праяўленняў. Таму культурнасць у дачыненні да асобы — гэта абавязкова шматграннасць. Наўрад ці можна гаварыць пра сапраўдную любоў да роднай культуры, калі чалавек, скажам, не мае ўяўлення пра помнікі дойлідства свайго народа і не імкнецца яго займець.



Мова і літаратура, як іпастасі культуры — з'явы гістарычныя. Вось гэтай прычынай і можна вытлумачыць, што студэнты філалагічнага факультэта адправіліся ў падарожжа Навагрудак — Мір — Нясвіж.

Старажытны Навагрудак — адзін з цікавейшых гарадоў Беларусі. Яго замчышча з рэшткамі адной з мацнейшых цытадэлей, спецыфічны культавыя забудовы, помнікі грамадзянскай архітэктуры, нарэшце музей Міцкевіча і «Курган памяці» — усё гэта здзівіла і ўразіла.

Мірскі замак — тытан, народжаны эпохай беларускага Рэнесанса. Нават цяпер, калі частку яго, як павуціне, зацягнулі будаўнічыя рыштаванні, а частка ўздымае ў неба напаўразбураныя муры, ён ашаламіў сваёй цэласна-манументальнай веліччу.



Нясвіж — горад-помнік. Звязаны з імёнамі Буднага і Цяпінскага. Знаёмства з яго замкамі, ратушай, гандлёвымі радамі, Слуцкай брамай і паркавым ансамблем было проста аглядным, бо для грунтоўнага не хапіла б, відаць, і тыдня.

Уражанні, уражанні! Яны, на жаль, былі рознымі. Такія факты, як занядбаны выгляд многіх помнікаў, моўны разнабой у афармленні музея Міцкевіча (пералічэнне можна прадоўжыць) пакінулі цяжкі асадак. А як бы хацелася, каб рэстаўрацыйныя работы і ў нас ў рэспубліцы вяліся хутчэй і на вышэйшым узроўні.





Усю зваротную дарогу з Нясвіжа да Мінска студэнты спявалі рускія, беларускія і ўкраінскія песні.

Па агульнаму меркаванню экскурсія прайшла ўдала. Яе вынікі — гэта азнаямленне і далучэнне да гістарычнай спадчыны свайго народа.

**І. ЗАПРУДСКІ.**
студэнт філалагічнага факультэта.



